# Гісторыя **адной мары**

**Скарбонка ўзнагарод Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа папоўнілася ў верасні дыпломам за перамогу ў намінацыі «Лепшы спектакль малой формы». Такую ацэнку спектаклю «Ваўкалак» па апавяданні Яна Баршчэўскага дала журы VII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Смаленскі каўчэг».**



Фрагмент спектакля «Ваўкалак».

Містычная пастаноўка віцебскіх артыстаў стала лепшай сярод 19 работ з Расіі, Беларусі, Польшчы і Швецыі. Ажыццявіла яе маладая рэжысёр Ірына Цішкевіч **(на здымку)**.



Традыцыйна рэжысура лічыцца мужчынскай прафесіяй. Таксама прынята думаць, што рэжысёрамі могуць быць толькі людзі з багатым жыццёвым досведам. Аднак Ірына сваім прыкладам разбурае стэрэатыпы. Яе шлях у прафесію пачаўся падчас вучобы ў тэатральным класе Лепельскай школы мастацтваў. Дзяўчына не ўяўляла сваё жыццё без тэатра, планавала паступаць у Акадэмію мастацтваў. Аднак напярэдадні ўступных іспытаў за кампанію з сяброўкамі паехала ў Віцебск – на прагляд, які арганізаваў рэжысёр Коласаўскага тэатра Віталь Баркоўскі, аб'явіўшы набор моладзі ў трупу. Ірына проста хацела яшчэ раз пераканацца ў сваіх сілах (такі ж конкурс чакаў яе і ў акадэміі). І здарылася так, што менавіта ёй прапанавалі месца ў трупе.

– Я адмаўлялася, казала, што мару стаць рэжысёрам, – прыгадвае Ірына Цішкевіч. – На гэта Баркоўскі адказаў, што кожны добры рэжысёр спачатку павінен паспрабаваць акцёрскага хлеба.

Яркая акцёрская кар'ера дзяўчыны працягвалася амаль 15 гадоў, але ж былая мара час ад часу ўзгадвалася. Аднойчы калега Ірыны, акцёр Вячаслаў Грушоў мімаходзь заўважыў: «Табе рэжысурай бы заняцца!» І гэты выпадак паставіў кропку ў сумненнях.

Майстрам рэжысёрскага курса ў Беларускай акадэміі мастацтваў, які скончыла гераіня нашага матэрыялу, быў прафесар Валерый Анісенка (на той момант ён сумяшчаў педагагічную дзейнасць і мастацкае кіраўніцтва тэатрам імя Якуба Коласа). Таму і першыя пастаноўкі Цішкевіч на сцэне тэатра з'явіліся яшчэ ў часы студэнцтва.

Ірына прызнаецца: галоўнае, чаму навучыла яе работа ў трупе, – гэта паважаць і цаніць акцёраў. Нягледзячы на тое, што яны часцей за ўсё вельмі амбіцыёзныя людзі. Рэжысёр узяла сабе за правіла перад канчатковым размеркаваннем роляў пытацца ў кожнага, ці гатоў ён працаваць у яе камандзе.

Пачынала Цішкевіч з пастаноўкі казкі, потым былі п'есы розных жанраў. «Ваўкалак» жа аказаўся асаблівым творам.

– Мне хацелася паспрабаваць зусім іншую манеру рэпетыцыі, – тлумачыць рэжысёр. – Традыцыйная чытка п'есы не ўяўлялася магчымай, бо літаратурны матэрыял складаўся з кавалкаў апавядання, песень і замоў. Тады я звярнулася да вопыту польскага рэжысёра Ежы Гратоўскага і англічаніна Пітэра Брука, якія рабілі ўпор на псіхафізічную падрыхтоўку трупы, ператвараючы спектакль у свяшчэнны акт.

Абраны шлях быў новым і для акцёраў. Рэпетыцыі, напрыклад, пачыналіся з псіхалагічных трэнінгаў. Незвычайны падыход выкарыстоўваўся і падчас работы з гукам: так, удзельнікі спектакля спрабавалі адчуць, як гучыць Зямля. Што тычыцца музыкі, то ў пастаноўцы выкарыстаны творы вядомага беларускага музыканта, фальклярыста, лідара этна-трыа «Троіца» Івана Кірчука.

– Творчасць Івана Кірчука і Яна Баршчэўскага ў нечым сугучная. Найперш тым, што іх творы – ад зямлі, ад вытокаў. Кірчук адчуў, чаму мне патрэбны менавіта яго песні, і згадзіўся аздобіць імі нашу пастаноўку, – распавядае Ірына. – А яшчэ ён прыязджаў на рэпетыцыі, прывозіў аўтэнтычныя інструменты, працаваў з артыстамі. І менавіта падчас узаемадзеяння з ім мы знайшлі той самы «гук Зямлі». З яго цяпер пачынаем падрыхтоўку да кожнага паказу «Ваўкалака».

Сакрэт поспеху спектакля Цішкевіч бачыць у тым, што ўдалося зрабіць галоўнае – сабраць каманду аднадумцаў.

– Балетмайстар Дзіяна Юрчанка, мастакі Юлія Карымава і Раман Баяранцаў, усе службы нашага тэатра – яны чулі і разумелі мяне з паўслова, – заўважае рэжысёр. – Работа над гэтай пастаноўкай адняла вельмі шмат душэўных сіл, але і дала нямала. Я перакананая, што кожны з нас будзе рады паўтарыць гэты досвед.

Вікторыя **ДАШКЕВІЧ**
Фота з асабістага архіву
Ірыны **ЦІШКЕВІЧ** і **БЕЛТА**